# КАЦЯРЫНА ЯНЧЭЎСКАЯ



## Твор з кропляў неба...

Вершы

Янчэўская Кацярына нарадзілася 27 чэрвеня 1981 года ў Лідзе. Паэт, мастацтвазнаўца. Вершы друкаваліся ў газеце «Літаратура і мастацтва», «Лідская газета», часопісах «Маладосць», «Тэрмапілы», у зборніку «Ад лідскіх муроў». Лаўрэат літаратурнага конкурсу «Бацькаўшчына светлая мая...», а таксама прэміі «Залаты апостраф» у намінацыі «Дэбют». Жыве ў Лідзе.

✦ ✦ ✦

Вечар. У вярчэнні нябесных сфер —  
маленькі чалавек.  
Ён зноў нічога не ведае.  
Вечар і вір адсутнасці.  
Асяроддзе нагадвае:  
«унутраная памяць хутка скончыцца».  
Сонца засынае  
на кончыках пальцаў людзей,  
яно — не адзінокае?  
У вярчэнні нябесных сфер  
схавалася стомленая павуцінка;  
засяроджаны павучок маркоты  
трымае лейцы наступнага дня.  
...Дзесьці блукае шчаслівая бясконцасць.

### Сад

Пасля дажджу,  
у адзенні з выявамі карцін Ван Гога  
гуляю па жывапісным садзе.  
Пасля дажджу,  
вышыня  
пераўтвараецца ў глыбіню.  
І ў мясцінах, дзе няма аліўкавых дрэў  
і платанаў,  
і на маляўнічай паверхні з вінаграднікамі  
і вясковымі хатамі  
празрыстыя кроплі абуджаюць  
новае святло і колер;  
кроплі з неба — дзейсная сувязь;  
у ваколіцах Арля  
і ў ваколіцах Ліды —  
у кожнага з нас ёсць свой сад,  
дзе адзенне — з мастацкіх вобразаў,  
дзе вышыня пераўтвараецца ў глыбіню,  
і нараджаецца твор з кропляў неба...

# МІКАЛАЙ ЯКАЎЛЕЎ



## Даўбешка

Апавяданне

Якаўлеў Мікалай нарадзіўся 17 чэрвеня 1994 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці. Скончыў Гомельскі дзяржаўны каледж транспарту і транспартных камунікацый. Аўтар кніг «Шнар», «Запрещенная любовь» (у суаўтарстве). Жыве ў Мінску.

Рыгор хутка спыніў сваю машыну каля прапускнога пункта і палез у бардачок за дакументамі. Краем вока ўбачыў нервовае чаканне службы бяспекі. Ён нават уявіў: адзін з іх — больш тлусты — гатовы націснуць трывожную чырвоную кнопку. Той нагадваў зараз яму самога сябе — такога ж тлустага, потнага і з пацучынымі вочкамі, якія бегаюць у розныя бакі ў пошуках пагрозы. І яны ніколі не супакояцца, і ў іх заўсёды будзе трапляць пот з надброўных дуг.

Але другі — малады, з фрызурай, як баскетбольная пляцоўка, ды моцнымі сківіцамі, як у актора Дольфа Лундгрэна — ужо, напэўна, зняў рулю з засцерагальніка і гатовы дастаць ды прымяніць зброю. «Ненавіджу яго»,— падумаў Рыгор, але яшчэ больш ён ненавідзеў сябе і свой страх.

Рыгор адчуў, як чарговы струмень поту намачыў кашулю на яго тлустай спіне, але нічога не мог зрабіць. Пальцы ледзь слухаліся яго, у галаве на паўторы крычаў нечы знаёмы і непрыемны голас «жывей!». Здавалася, усё перад ім плыве. І вось, ён адшукаў аркуш з сінім штампам. Тоўстыя пальцы, што ўзялі аркуш за рог і дасталі з папкі, ледзь слухаліся яго. Ён засяродзіў на іх сваю ўвагу і ўзгадаў, як яшчэ паўгады таму быў паджары.

Мужчына не заўважыў, як падчас успамінаў аўтаматычна перадаў дакументы, і толькі голас супрацоўніка, нечаканы, як гром у яснае надвор'е, прымусіў падскокнуць на месцы. Пот паліўся мацней.

— Прадпрыемства «ШухВухТун». Кіраўнік — Шай Коэ Лінь,— прачытаў услых малады з аркуша і перавёў позірк у сваю папку, пакуль Рыгор ліслівa ўсміхаўся яму ды папраўляў акуляры на носе. Яго рукі дрыжалі.

— Рыгор Рыгоравіч Эрмэнсан? — з усмешкай сонечнага хлопчыка перапытаўся супрацоўнік з «пляцоўкай» на галаве.

# КАЦЯРЫНА ШЧАСНАЯ



## Першакрыніцы

Вершы

Шчасная Кацярына нарадзілася 18 кастрычніка 1984 года ў горадзе Баранавічы Брэсцкай вобласці. Скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Навучалася ў аспірантуры і дактарантуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа. Даследуе сучасную беларускую мову, граматычныя нормы, моладзевае і сцэнічнае маўленне. Літаратурныя творы друкаваліся ў часопісах «Маладосць», «Бярозка», «Полымя», газеце «ЛіМ». Жыве ў Мінску.

### Антывірус

У электрычцы сядзелі
Хто ў масцы, хто без,
Асобна і змушана побач.
З панурым настроем,
Хоць ехалі дадому.
Бо куды яшчэ тут паедзеш?
Раптам у вокнах убачылі мора!
Цягнік едзе, нібы па вадзе,—
Так увесну разліўся Нёман.
(Праўда, ападкаў было нямнога.)
І ўсе завохкалі хорам:
«Як прыгожа!», «Неверагодна!»
Забыліся на хваробы, забароны,
Гаманілі хвілін сорак,
Як можа быць гаюча дома
І які цудоўны антывірус Нёман.

### Вілейскі праменад

У касцёле шакаладнага колеру
Імкнуся спазнаць прасвятленне Боскае...
Сустракаюся з позіркам маладзёна,
Надумваю сабе санеты а-ля Петрарка.
Але, можа, там, у думках, банальнае:
«Яна не адсюль. Яна праваслаўная».
Праменад па Вілейскім пляжы.
Сонца доўга прагравае бераг
І нізкія шэра-блакітныя хвалі.
Зноў натхнення шукаю...
Адчуваю хітры позірк. Чайка!
Як у французскім мультфільме,
Так нахабна з маіх рук
Хрумсткую булку хапае.

# ЖАННА МІУС



## Яблычны Спас

Аповесць

Міус (Усцінава) Жанна нарадзілася 18 студзеня 1976 года ў вёсцы Капачы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Працавала настаўнікам, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце. Аўтар кніг паэзіі «Лунный чай», «Інтанацыя», «Мае медуніцы» і кніг для дзяцей «Странные детки», «Первоапрельский суп», «Нескучательная дочка», «Сиреневая Соня в Чудесонии», «Рыцарь кастрюли с шумовкой», «На пытанне ёсць... паданне», «Малёк Удалёк і Жах-Рыба». Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя А. Пысіна, а таксама шэрага літаратурных конкурсаў.

Твар яго зіхацеў, а ўбранне было бялюткім, нібыта снег.

*Евангелле ад Мацвея 28:3*

### I

Жэнька ніколі не кланялася яму жывому. Малая была — не разумела навошта, дзяўчынай — хапала іншых клопатаў: шчасці і няшчасці дажджыста, спорна ліліся з прадоння маладых блакітна-шэрых вачэй. Ён цярпліва падбіраў яе слязіны і загойваў надуманыя «раны» на сэрцы. Па-старэчы ўважліва слухаў, не вушамі — душою. Бачыў тое, што не павінен быў бачыць больш ніхто на гэтым свеце,— яе жах, які кругліў вочы і працінаў непрыемнай дрыготкаю чуллівыя пальцы, яе горкую-прагорклую крыўду, яе чорную, ліхую злоснасць і доўгасцяжынныя роздумы.

Цяпер прыйшоў момант пакланіцца...

Дурніца, каму? Таму, каго няма ўжо зараз на свеце? Таму, хто больш ніколі не сустрэне, не ўсміхнецца, не прылашчыць? Не схавае ад адвечных жыццёвых турбот — чалавечых. Позна... Як позна...

Яго ўжо знішчылі!

Учора? Месяц таму? А можа, паўгода? Урэшце, якая розніца! Зараз Жэнька стаіць над яго забітым целам, пасечаным, пакрамсаным неахайна, наспех, і гора міжволі сагнула яе ў глыбокі роспачны паклон...

### II

...Яна нечакана рашыла завярнуць сюды — у малую вёску, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва, дзе калісьці жылі бацькі, каб набраць яблыкаў да свята. Захацелася чамусьці заўтра — на Яблычны Спас — схадзіць у царкву з духмяна-сакавітымі

# ТАЦЦЯНА ЦВІРКО

## Два апавяданні



Цвірко Таццяна нарадзілася 25 жніўня 1967 года ў вёсцы Рассветная Клецкага раёна Мінскай вобласці. Скончыла Нясвіжскае педагагічнае вучылішча і філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала ў дзіцячым доме № 1 і загадчыкам дзіцячага сада ў Клецкім раёне, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Даматканавіцкай сярэдняй школе. Была дырэктарам прыватнага прадпрыемства «Рунька-торг». Аўтар зборніка вершаў і песень «Ясачка долі маёй», кнігі прозы «Слодыч мяты — горыч палыну», паэтычных зборнікаў «Зноў з табой я, месцейка святое», «І толькі май іх не забудзе», «Вершам прарасту...». Лаўрэат літаратурнай прэміі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ў намінацыі «Паэзія» (2023). Лаўрэат і дыпламант шэрага рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных конкурсаў.

### Двое ў лодцы

Двое ў лодцы пад асляпляльнай беллю бязважкіх аблокаў. Ён і яна... Ён такі прыгожы! Высокі і статны, з шырокімі плячыма і смуглым целам, нібы нядаўна вярнуўся з працяглага падарожжа пад гарачым сонцам. З доўгімі валасамі колеру крумкачовага крыла пад блакітнай банданай, з такой жа чорнай галівудскай бародкай, з тэмпераментнымі ільвінымі вачыма і цвёрдым праніклівым поглядам. Яе мара! Ён так загадкава ўсміхаецца і лёгенька дакранаецца да дзявочага пляча Ангеліны сваімі цёплымі вуснамі... О! Не перадаць словамі, што яна адчувае ў гэты момант! Свеціцца ўся, быццам апранутая ў сонца!

Імгненне — і яны, узяўшыся за рукі, пайшлі-паплылі па пухам вытканай месяцовай дарожцы... Ляціць саспелым яблыкам у рукі поўня... А яны, абняўшыся, ныраюць у дзіўную світальную бездань... Галавакружна пахне расквітнелым язмінам. Так светла, так лёгка! Стракочуць сваю пранізлівую песню цвыркунчыкі...

І Ангеліна прачынаецца. Праз некалькі секунд яна разумее, што гэта быў толькі сон. Яркі, цёплы, сонечны... Залівістым гукам цвырчыць будзільнік на мабільніку. Думкі не хочуць адпускаць убачанае і перажытае ў сне. Але не сунімаецца будзільнік. Пачынаецца звычайная раніца. Раніца маладой маці і клапатлівай жонкі.

# МІХАСЬ ПАЗНЯКОЎ



## Удзячнае сэрца пяе

Вершы

Пазнякоў Міхась нарадзіўся 24 студзеня 1951 года ў вёсцы Заброддзе Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў настаўнікам у школах Бярэзінскага раёна і Мінска, навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства АН Беларусі, дырэктарам Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, галоўным рэдактарам выдавецтва «Юнацтва», часопісаў «Вожык», «Нёман», намеснікам дырэктара РВУ «Літаратура і мастацтва». З лістапада 2005 года — старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар больш як ста кніг паэзіі, прозы, публіцыстыкі, крытыкі, перакладаў, слоўнікаў, навукова-пазнавальных кніг для дарослых і дзяцей. Ганаровы грамадзянін Быхаўскага раёна. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, літаратурных прэмій імя П. Броўкі, Я. Маўра, В. Віткі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, трох Рэспубліканскіх прэмій «Лепшая кніга года» і інш. Лаўрэат міжнародных літаратурных прэмій імя В. Біянкі, М. Гогаля, Р. Скаварады, Г. Бёля, А. дэ Сент-Экзюперы, Ф. Пятраркі, М. Твэна ды інш. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны медалямі Францыска Скарыны і «За працоўныя заслугі».

* * *

Праз стагоддзі глухія,
Праз агонь варажжы,
Адалеўшы стыхіі,
Рэчка вольна бяжыць.

У ракі гэтай годнай
Пуцявіна свая,
Бег — красы невыводнай,
Беларусь — ёй імя.

Марна хтосьці люцее...
Між турбот і трывог
Рэчкі плынь не мялее,
З ёю Праўда і Бог!

### Грэза

У раку дзяцінства Грэзу
Акунуцца б з галавой!
Ах, ці помніш ты гарэзу,
Так зарослая травой?

Ах, ці помніш, як ласкава
Чысціў рэчышча тваё,
З берагоў выкошваў травы,
Вудзіў плотак, акунёў?

Ах, ці помніш, як гаіла,
Як натхняла шмат гадоў?
Многа дзе мяне насіла —
Да цябе прыехаў зноў.

# БРАМАМАР



Дарагія сябры!

Мы прапаноўваем вам творчыя работы пераможцаў Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «БрамаМар», які ўжо 15 гадоў праводзіцца кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ. Мы праводзім конкурс у пошуку новых талентаў і для падтрымкі творчай моладзі, настаўнікі і бацькі дапамагаюць нам у гэтым. Дзякуй за веру ў наш конкурс!

Так гістарычна склалася, што беларуская літаратура — гэта літаратура маладых (не верце фотаздымкам пісьменнікаў у падручніках, яны ўсе прыйшлі да творчасці рана). Ландшафт беларускай літаратуры на наступныя дзесяцігоддзі закладаецца сёння — і мы ўпэўнены, што сярод будучых класікаў усе пабачаць нашых фіналістаў розных гадоў. Прапанаваць свае тэксты і свой талент на суд журы — смелы і адказны крок, які, аднак, узнагароджваецца.

Чытайце творы нашых пераможцаў! Удзельнічайце ў конкурсе (ён хутка пачнецца)!

*Дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі,*
*кандыдат філалагічных навук*
*літаратуразнаўца Аксана Бязлепкіна-Чарнякевіч*

# ПАЭЗІЯ

## Любоў Бобка

### Дзённік медсястры

Мне здаецца, што гэта ніколі
не скончыцца...
Не прымчыць дапамога, не прыйдзе вясна,
Толькі смерць побач у мёрзлых акопах
згорбілася
І зларадна нам шэпча:
«Далей толькі вайна».

Я пужаюся і гэтых стрэлаў, і выбухаў,
Нават пораху пах прымушае дрыжаць.
А трывога не дасць і хвілінкі,
каб выдыхнуць,
Толькі душыць мацней і ўганяе ў жах.

Я ўцякаць спрабавала ад маральнай
магілы:
Выкідала бінты, тапіла ў рэчцы халат...
Але кінуць салдат не знайшла ў сабе сілаў,
Гэтых раненых, смелых і шчырых рабят,

Што ніколі, ніколі цябе не пакрыўдзяць
І заўжды ўсміхнуцца, завітаўшы ў шпіталь,
Што заўсёды падзеляцца хлеба скарынкай
І гатовы апошняе сябру аддаць.

Колькі жа цяпер у свеце дзяўчатак
палонных
Сваім хлопцам не могуць у вочы глядзець,
Колькі жа на зямлі нашай дзетак галодных
Засталося адных сярод снега і смерці!

Мне здаецца, што ў жудасным гэтым
кашмары
Немагчыма знайсці ні канца, ні прасвету.
Ну чаму ад вайны адны толькі ахвяры?
Божа, дай толькі нам перажыць зіму гэту...

ІНТЭРВ'Ю

# АЛЕГ ЖДАН

## Шчырасць пісьменніка



*Чытаючы яго, быццам знаходзіш сябе — жывога, які аднойчы прачнуўся, як спячая почка расліны, што доўгі час знаходзіцца ў стане спакою і здаецца нежывой, але насамрэч захоўвае здольнасць да развіцця. У такім стане можна заставацца гадамі, і, каб актывізавацца, патрэбны пэўныя ўмовы... Напрыклад, творы Алега Ждана, асабліва аповесць «Геній» і апавяданне «Апошні сябар». Почка перастае спаць і пачынае развівацца: дае лісцікі, парастак, а потым, глядзі, і зацвіце... Пра тонкасці працэсу — у гутарцы з пісьменнікам Алегам Жданам.*

***— Маці з вашай аповесці «Геній», не выпусціўшы б на свет Трышку, баялася здзейсніць злачынства перад Богам. Як часта вам даводзілася адчуваць падобную боязь у сваім жыцці? І як хутка вы зразумелі Яго прысутнасць і прычынна-выніковую сувязь паміж злачынствам і пакараннем?***

— Праступкаў я здзейсніў у сваім жыцці мноства, не перастаю каяцца і раскайвацца. Сувязь паміж злачынствам і пакараннем, вядома, ёсць. Або так: павінна быць. Яшчэ больш дакладна: будзем спадзявацца, што ёсць. Гэтулькі няшчасцяў у свеце на памяці аднаго пакалення, што крыўдна і несправядліва, калі такой сувязі няма.

***— Трышка бачыцца свайго роду юродзівым, бо не баіцца казаць праўду. Як суадносіцца гэта з лёсам пісьменніка, які таксама павінен гаварыць праўду? Яму рыхтавацца да выгнання ці лепш тады маўчаць? Смеласць можа стаць тут ворагам?***

— А вось гэта добрае пытанне, на якое ў мяне адказу няма. Думаю, абавязак пісьменніка, як, уласна, і любога чалавека, проста не лгаць. Ужо гэтым ён выканае свой першасны грамадзянскі абавязак.

***— Вашы персанажы пераважна неадназначнага характару. Поўнасцю станоўчых або поўнасцю адмоўных не бывае? А людзей? Чаму?***

— Што да нашых літаратурных персанажаў і людзей, побач з якімі жывём, — так, адназначных няма. Адназначна станоўчы — гэта святы, адмоўны — чалавек са скажэннем псіхікі. Я апошнім часам шмат чытаў і думаў пра нямецкі і італьянскі фашызм. Што як не параджэнне пекла Гітлер з яго блізкім асяроддзем? Я нават быў моцна здзіўлены, калі ў адзін з апошніх дзён на нарадзе са сваім генералітэтам ён раптам упаў на стол і заплакаў. Цалкам чалавечы ўчынак. Шкада, бач, сябе стала.

«Князь. Государыня. Епископ», «Не загіне са мной» — пра нарадавольца, вынаходніка першага паветраплавальнага апарата Мікалая Кібальчыча, кніг аповесцей і апавяданняў «Геній», за якую ў 2019 годзе атрымаў Нацыянальную прэмію, апавяданняў, што склалі кнігу «Апошні сябар», якая выйшла сёлета, спатрэбілася шмат. І ўсё гэта, вядома, дзякуючы прамому ці ўскоснаму ўдзелу маёй жонкі, Ніны Леанідаўны, якая і сама была ўсе гэтыя гады вельмі занятая. Па прафесіі яна педагог, і, як я разумею (і як разумеюць яе калегі і былыя вучні), добры. Дзякуючы ёй у нас выраслі цудоўныя сыны. Вось і ўвесь сакрэт.

● ***— Што, на ваш погляд, забяспечвае творам пісьменніка доўгае жыццё і запатрабаванасць? Піяр, наватарства стылю ці справядлівыя стаўкі, якія зробіць час?***

● — Пытанне, як кажуць, не новае, і поўны адказ немагчымы. Вядома, і стылявое наватарства, і тэматычная навізна, і патрабаванне, правільней — выбар часу... Ну, і без піяру ты сёння падарожнік, які згубіўся ў натоўпе.

● ***— «Заўсёды маліся, любі і даруй»,— раіў старац Парфірый Каўсакалівіт. Ці проста жыць такім падыходам? Што, на ваш погляд, дапамагае душы ачышчацца і быць заўсёды маладой?***

● — У трыядзе гэтай мне бліжэйшае апошняе — «даруй». Я заўсёды быў згодзен забыцца на крыўду, не трымаць у душы зла. Але ёсць грахі, ачысціцца ад якіх можа дапамагчы толькі пакаянне, ды і тое — часова.

● ***— Без чаго не ўяўляеце жыццё?***

● — Без родных і сяброў, без працы: творчай, фізічнай — усё роўна, без чытання. Без надзеі, што заўтра зноў будзе добра ці не горш.

*Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА*

Фото з архіва А. Ждана



АСОБА

# АКСАНА СПРЫНЧАН

## Паміж стажар'ем і Стажарамі

37 фактаў
пра Рыгора Семашкевіча
да 80-годдзя
з ягонага нараджэння

**1.** Аўтар знакамітага верша пра аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры — «Францішак Багушэвіч», які ўвайшоў у першую кнігу «Леснічоўка» (1968):

Ніякія годы,
Паходы,
Нягоды
Ад нас не адрынуць той час.
І світка мужыцкая днее пагодна —
Ашмянскага крою якраз.

Якія дакоры
Бываюць у гора?
Імжыць праз гады сіратлівы пагляд.
На ўсю Беларусь мільён пракурораў
І толькі адзін, толькі ён адвакат.

**2.** Напісаў адзіны верш у беларускай літаратуры, натхнёны Статутам ВКЛ 1529 года. «Хто бы дерево бортное чужое со пчолами — сосну — сказил або пожаром опалил або якое-колве шкоду дереву вчинил, тот за тое дерево и за пчолы повинен будеть платити тому, чие будеть, копу грошей...» — гэта эпіграф з першага Статута да верша «Ашчаднае сярэднявечча...».

**3.** Стварыў найвядомейшы верш пра Вайсковыя могілкі — «Вайсковыя могілкі Мінска...» (1972).